


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 8 (225) 28 верасня 1995 года, чацвер


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

**8 верасня адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага Савета універсітэта. На ім былі разгледжаны наступныя пытанні: аб выніках летняй экзаменацыйнай сесіі і дзяржаўных экзаменаў 1994-95 навучальнага года; аб выніках уступных экзаменаў ва універсітэт у 1995 годзе; зацвярджэнне каштарыса выкарыстання фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця і фонду матэрыяльнага заахвочвання.**

І. П. Мартынаў, прарэктар па навучальнай працы, прааналізаваў вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі і дзяржаўных экзаменаў у параўнанні з зімовай сесіяй, адзначыў, што на жаль, не заўсёды строга выконваліся асноўныя патрабаванні Палажэння аб здачы экзаменаў; у справаздачах старшынь дзяржаўных экзаменацыйных камісій ёсць нямала слушных заўваг па паляпшэнню працы. Вучоны Савет пастанавіў: дэканам арганізаваць правядзенне комплексных кантрольных работ на курсах з далейшым аналізам іх вынікаў на саветах факультэтаў; унесці неабходныя карэктывы ў арганізацыю навучальнага працэсу; арганізаваць распрацоўку метадычных рэкамендацый па падрыхтоўцы дыпломных работаў, азнаямленне кожнага студэнта з «Палажэннем аб курсавых экзаменах і заліках у вышэйшых навучальных установах», падрыхтаваць праект выпуска спецыялістаў у 1996 г. у разрэзе формаў навучання па спецыяльнасцях; правесці навукова-метадычную канферэнцыю па разгляду метадаў інтэнсіфікацыі вучэбнага працэсу.

У.М.Карчэўскі, адказны сакратар прыёмнай камісіі, паведаміў, што камісія кантролю Прэзідэнта РБ выказала ўдзячнасць членам прыёмнай камісіі за добрасумленную працу; пасля аналізу вынікаў уступных экзаменаў было прапанавана: працу прыёмнай камісіі пачынаць з верасня; асаблівую ўвагу надаць прафарыентацыйнай рабоце ў школах горада і вобласці; у склад прыёмнай камісіі ўключаць самых сур'ёзных і добра падрыхтаваных людзей.

Вучоны Савет зацвердзіў каштарыс выкарыстання фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця і фонду матэрыяльнага заахвочвання.

Вучоны Савет вырашыў дапамагчы факультэту псіхалогіі і педагогікі ў стварэнні лабараторыі эксперыментальнай псіхалогіі і набыць адпаведнае абсталяванне. Вучоны Савет рэкамендаваў С.В.Кандрацьеву, загадчыка кафедры, да ўдзелу ў конкурсе на выбранне членам Акадэміі сацыяльна-педагагічных навук.

## Экспрэс - інфармацыя

● Граматай Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь і грашовай прэміяй узнагароджаны **Барыс Міхайлавіч Іванчук**, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі за шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць.

● Дыпломам Міністэрства адукацыі і навукі Республікі Беларусь узнагароджаны **Мікалай Мікалаевіч Іваноў**, дацэнт кафедры дастасоўнай матэматыкі за высокі ўзровень кіраўніцтва навуковымі працамі студэнтаў, прадстаўленымі на рэспубліканскі конкурс «Кібернетыка і камп'ютарныя тэхналогіі XXI стагоддзя».

● Амерыканскім біяграфічным інстытутам з ліку пяці тысяч кандыдатаў чалавекам года названы **Іван Платонавіч Мартынаў**, прарэктар па навучальнай працы Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

● Рашэннем атэстацыйнай камісіі прысвоена вучонае званне дацэнта: па спецыяльнасці «класічная філалогія» **В.В.Валашчуку**; па кафедры матэматычнага аналіза **В.А.Пронька**; па кафедры гісторы Беларусі **І.А.Фёдараву**; па кафедры біяхіміі і біятэхналогіі **В.М.Туманаву**; па кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі **С.Гайдзе**; па кафедры замежных моваў **З.І.Штоп**; па кафедры педагогікі **М.У.Міхалковічу**.

● Па выніках удзелу зборных камандаў у Спартакіядзе вну ўпершыню за гады існавання універсітэта імя Янкі Купалы і педагагічнага інстытута ў комплексным заліку каманда Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы заняла 2 месца (напераздэ - каманда Акадэміі фізічнага выхавання).

● Загадам Міністэрства адукацыі і навукі Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы адзначаны як адзін з найлепшых удзельнікаў па колькасці навуковых публікацый у галіне фізічнай культуры і спорта.

## АДБЫЛАСЯ НАРАДА УНІВЕРСІТЭТА

**31 жніўня адбылася нарада Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы «Аб выніках працы калектыва універсітэта за 1994-95 навучальны год і задачах на наступны год».**

Рэктар універсітэта **Л.М.Ківач** павіншаваў выкладчыкаў і супрацоўнікаў з пачаткам навучальнага года і выступіў з падрабязным аглядам працы калектыва за 1994-95 навучальны год, засяродзіўшы ўвагу на асноўных задачах і праблемах.

Галоўная мэта, якой прытрымліваўся калектыў універсітэта ў сваёй працы на працягу года, - адзначыў Л.М.Ківач,- развіццё універсітэта як цэнтра адукацыі, навукі і культуры ў вобласці, задавальненне патрэбаў асобы, падтрымка спецыялістаў і правядзенне даследчай працы. Ва універсітэце адчынілі дзверы новыя факультэты - гуманітарны, замежных моваў; аддзяленні - псіхалогіі, мастацтваў, падрыхтоўкі замежных студэнтаў; створаны новыя метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы курсавых і дыпломных працаў. Важнай праблемай застаецца пытанне кадраў выкладчыкаў: назіраецца зніжэнне працэнта выкладчыкаў з навуковымі званнямі; неабходна падтрымка і стымуляванне навукоўцаў. Не можа задаволіць і матэрыяльнае становішча універсітэта. Нашы клопаты: нізкая заработная плата (магчымасці вырашэння гэтага пытання вельмі абмежаваныя); недахоп аўдыторый (няма належнай падтрымкі з боку Міністэрства адукацыі і навукі і гарадскіх уладаў); пытанне паляпшэння жыллёвых умоў і забеспячэння інтэрнатамі.

Па шэрагу напрамкаў працы універсітэт зрабіў крок наперад,- адзначыў рэктар і выказаў спадзяванне, што асноўныя цяжкасці калектыў універсітэта ўжо адолеў.

Аб выніках працы прафсаюзнага камітэта універсітэта паведаміла прысутным **Л.І.Баброўнік**, член прафкама: гэта і размеркаванне кватэр у доме па вул. Горкага (22 кватэры);і пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку для супрацоўнікаў і іх дзяцей ( 11 - дзіцячых; 24 - фондавыя; у мінулым годзе - 104), 36 пуцёвак атрыманы універсітэтам на грошы ад камерцыйнай дзейнасці, 5 пуцёвак - бясплатныя; і арганізацыя мерапрыемстваў (дзень сям'і, сустрэча ветэранаў, навагоднія падарункі і балі для дзяцей, святкаванне 8 Сакавіка);і размеркаванне матэрыяльнай дапамогі.

**Т.А. Герашчанка**, галоўны бухгалтар універсітэта, прывяла лічбы фінансавання з бюджэту, памеру заработнай платы, сродкаў, выдзеленых на аказанне матэрыяльнай дапамогі, на размеркаванне прэмій, гаспадарчых расходаў. Універсітэт мае неаплочаных рахункаў на суму 260 мільёнаў рублёў. Ад камерцыйнай дзейнасці за мінулы год атрымана 4 мільярды 156 мільёнаў рублёў.

Прарэктар па АГЧ **Я.А.Саўчук** засяродзіў увагу на асноўных праблемах, якія павінны быць вырашаны ў першую чаргу: набыццё новых вучэбных плошчаў; забеспячэнне аўдыторый мэбляй; эканомнае выкарыстанне электраэнергіі; вырашэнне праблемы харчавання студэнтаў; недахоп месцаў у студэнцкіх інтэрнатах; выхаванне ў студэнтаў беражлівых адносінаў да інвентару ва аўдыторыях і інтэрнатах.

**У.М.Карчэўскі**, адказны сакратар прыёмнай камісіі прывёў лічбы ў плане прыёму на 1995-96 навучальны год у параўнанні з мінулым годам, адзначыў добрасумленную і плённую працу членаў прыёмнай камісіі, адзначаны лепшыя справаздачы старшынь камісій. Прадметныя камісіі і лічбы вынікаў уступных экзаменаў пацвердзілі, што зніжаны ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў. Улічваючы патрабаванні прэзідэнцкай камісіі і Міністэрства адукацыі і навукі з мэтай рэарганізацыі вышэйшай адукацыі, ёсць сэнс на наступны навучальны год склад прыёмнай камісіі зацвердзіць ужо ў верасні бягучага года. Адзначана нізкая прафарыентацыйная праца некаторых факультэтаў.

Улюстэрку статыстыкі

# Першакурснікі: ХТО ЯНЫ?

● У 1995 годзе на аддзяленні давузаўскай падрыхтоўкі здавалі выпускныя экзамены 467 слухачоў. З іх падалі дакументы ў прыёмную камісію 332 слухача АДП, здалі ўсе экзамены і залічылі адзнакі 77 слухачоў, здалі часткова экзамены і залічылі іх 170 слухачоў АДП.

● У адпаведнасці з рашэннем прыёмнай камісіі здавалі сумяшчальныя выпускныя экзамены ў ліцэях і гімназіях з удзелам у конкурсе на вызначаныя 20% месцаў ад агульнага плана прыёму на кожную спецыяльнасць, і 80 выпускнікоў ліцэяў і гімназіяў па выніках сумяшчальных экзаменаў былі рэкамендаваны да залічэння па агульнаму загаду пасля здачы ўступных экзаменаў.

● План прыёму на завочную і вячэрнюю формы навучання склаў 270 студэнтаў, было пададзена заяваў - 503; вытрымалі ўступныя экзамены на завочную і вячэрнюю формы навучання 330 абітурыентаў; залічана на бюджэтную форму навучання 272 студэнты.

● План прыёму на дзённае навучанне склаў 885 студэнтаў, было пададзена 1590 заяваў; вытрымалі ўступныя экзамены на дзённую форму навучання 1034 абітурыенты.

● Ад медалістаў агульнаадукацыйных школаў было пададзена 310 заяваў; па выніках сумоўя (мэтавы прыём) залічана 70 абітурыентаў і па выніках экзаменаў - 159 абітурыентаў.

● Ад выпускнікоў ССНУ і ПТВ было пададзена 149 заяваў і залічана 17 выпускнікоў ССНУ і ПТВ.

● У ГрДУ імя Я.Купалы ў адпаведнасці з планам мэтавага прыёму было зацверджана 268 месцаў на педагагічныя спецыяльнасці, на каторыя было пададзена 285 заяваў і ў выніку залічана па мэтавых накіраваннях 180 абітурыентаў.

● Студэнтамі 1 курса дзённай формы навучання залічана 882 абітурыенты.

● Прахадны бал на дзённую форму навучання:

матэматыка - 10,5; эканамічная кібернетыка - 11,5; праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій - 10; фізікатэхнічны факультэт - 9; факультэт біялогіі і экалогіі -9; беларуская мова і літаратура-11; руская мова і літаратура - 12; славянскія мовы і літаратуры - 12; гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю культуралогія - 10,5; псіхалогія - 9,5; правазнаўства - 11,5; фізічная культура - 12; музыка і спевы - 16; выяўленчае мастацтва і чарчэнне - 13,5; англійская мова - 13; нямецкая мова - 13,5; французская мова - 12; педагогіка і методыка пачатковага навучання з дадатковай спецыяльнасцю музыка і спевы - 9; ПіМПН з дадатковай спецыяльнасцю выяўленчае мастацтва - 9; ПіМПН з дадатковай спецыяльнасцю педагогіка - 9; міжнародныя эканамічныя адносіны - 14,5.



● Сярод першакурснікаў 288 - рабочыя ці дзеці рабочых, 44 - калгаснікі ці іх дзеці.

● Колькасць паступіўшых дзяўчат пераважае над юнакамі: 566 да 316.

● З ліку студэнтаў 1 курса 477 чалавек- жыхары г. Гродна, 195 чалавек пражываюць у сельскай мясцовасці.

# Размовы з першакурснікамі

**Сярод 882 залічаных у лік студэнтаў нашага універсітэта - і гэтыя маладыя людзі, з якімі мне давялося пагутарыць у апошні дзень лета, калі школа ўжо у мінулым, а студэнцкае жыццё пачнецца праз адзін дзень. Яны зрабілі вельмі важны крок, магчыма, найгалоўнейшы ў сваім жыцці. Яны яшчэ не адчулі гэтага, усведамленне ўпэўненасці прыйдзе пазней, а хтосьці, можа быць і такое, і расчаруецца. Але гады жыцця ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы ні для каго не пройдуць бясследна.**

**Наталля Лях і Анжаліка Барко,** студэнткі 1 курса матэматычнага факультэта. Паспелі пасябраваць і на свой першы студэнцкі арганізацыйны сход прыйшлі разам.

- Мы паступілі на матэматычны факультэт па сумоўю. Пасля заканчэння школы - медалісткі. Не сорамна перад сваімі настаўнікамі: свае выдатныя школьныя адзнакі мы апраўдалі, трывалыя веды ой як спатрэбіліся пры паступленні! Аб чым думаецца перад першым днём вучобы? Упэўнены, нас чакае новае цікавае жыццё.

Наталля расказала аб тым, што заўсёды ёй спадабалася каралева навук - матэматыка, тым больш што настаўніца так цікава яе выкладала... А ў Анжалікі бацька -матэматык, ён і падштурхнуў дачку да выбару.

**Вольга Андросік,** студэнтка 1 курса факультэта замежных моваў:

- Скончыла Дзятлаўскую школу. Паступіла па мэтаваму накіраванню, па выніках экзаменаў мела 11 балаў. Вельмі марыла аб універсітэце... Кожны дзень пачынала з пытання да сябе: ці студэнтка я? І вось убачыла сваё прозвішча ў спісах залічаных: былі і радасць, і гонар, і хваляванне. І нават (па сакрэту мама кажа) сёння яшчэ раз, перад сходам, зазірнулі на дошку аб'яваў, адшукалі сваё прозвішча. Веру, што ў мяне ўсё атрымаецца, бо мара здзейснілася, бо мне падабаецца англійская мова.

Тройка ўпэўненых у сабе, на першы погляд, студэнтаў 1 курса факультэта замежных моваў: **Аляксандр Трылінг, Генадзь Русін, Віктар Паўшук:**

- Знаёмы мы яшчэ з АДП. Не дацягнуліся да прахаднога бала, у гэтым нам усім, на жаль, не пашанцавала. Цяжка будзе бацькам нас вучыць. Але ўвогуле ўсё цудоўна: мы - студэнты! Рашэнне аб выбары факультэта прымалі самастойна, нам і вучыцца дастойна! Што такое студэнцкае жыццё? - нялёгкая праца і цікавае вясёлае жыццё - усялякім чынам, так кажуць выпускнікі.

На тварах маіх субяседнікаў - шчаслівыя ўсмешкі, на душы - урачыста, сонечна і радасна.

**Дарагія першакурснікі! Не адкладвайце ўсе справы на заўтрашні дзень, удзельнічайце ва ўсім, што адбываецца ва універсітэце, і вы абавязкова станеце цікавымі людзьмі. У добры шлях!**

*Н.ДУДКО*

# ВІНШАВАННІ



## БАДЗЁРАСЦЬ І ПРАЦА

Сёння сярод нас не шмат людзей, якія, нягледзячы на сталы ўзрост, працягваюць працаваць, актыўна ўдзельнічаюць у жыцці вну. Сярод іх - ганаровы акадэмік, член Акадэміі касманаўтыкі імя К.Э. Цыалкоўскага, доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры фізічнага выхавання Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы **Анатоль Іванавіч Яроцкі**. Сёння мы віншуем яго з 80-годдзем.

Анатоль Іванавіч праводзіць тэарэтычныя і практычныя заняткі са студэнтамі, вядзе навукова-метадычную працу.

Чалавек у поўным здароўі, бадзёры, рухавы, энергічны.



Упэўнены ў сіле прынцыпа рухавай актыўнасці для ўсіх узростаў, Анатоль Іванавіч лічыць, што заняткі спартыўнымі гульнямі (бадмінтонам, валейболам, тэнісам, плаваннем, прагулкамі на веласіпедзе і пешшу) рацыянальныя і карысныя для кожнага чалавека. Тэніс - асаблівае хобі Анатоля Іванавіча. Сваё здароўе наш калега трымае ў сваіх руках. За доўгія гады працоўнай дзейнасці ён ніводнага разу не звярнуўся да ўрача, ніколі не атрымліваў ліста захворванняў.

Ніколі не адмовіў Анатоль Іванавіч каму-небудзь у кансультацыі, у дапамозе вызначэння дыягназу ці выбары лячэння. А.І.Яроцкі прымяняе метад нізкаінтэнсіўнага лазернага апраменьвання. Многія спартсмены, студэнты, супрацоўнікі вну карыстаюцца паслугамі лабараторыі прафесара.

А пачаў свой працоўны шлях Анатоль Іванавіч Яроцкі ў далёкім 1931 годзе, скончыў Ленінградскі інстытут фізічнай культуры імя П.Ф. Лесгафта, потым - 1-ы Ленінградскі медыцынскі інстытут. А.І. Яроцкі - удзельнік дзвюх войнаў: з белафінамі і Вялікай Айчыннай. У гады вайны ён распрацаваў комплексны метад лячэння ранаў, якія доўга не загойваліся, тым самым многія пашаненыя байцы хутчэй папраўляліся і вярталіся на фронт.

У пасляваенныя гады прафесар А.І. Яроцкі ўзначальваў групу экспедыцыі, якая правяла ў пустынях Сярэдняй Азіі выпрабаванні ўстойлівасці чалавечага арганізму да высокіх тэмператураў. Вопыты ён праводзіў на сабе. Тэмпература паветра +50, глебы +70, цела +41. Ад смяротнай адмецiны аддзяляла адна дзясятая градуса. Толькі добра трэніраваны арганізм здольны быў вытрымаць гэта.

Анатоль Іванавіч лічыць, што стогадовы ўзрост не з'яўляецца мяжой для актыўнай і творчай дзейнасці.

Віншуем Анатоля Іванавіча Яроцкага з нагоды юбілею і спадзяемся, што сваю бадзёрасць ён захавае яшчэ на доўгія гады.

*КАЛЕКТЫЎ КАФЕДРЫ ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ*

## ВУЧОНЫ І ПЕДАГОГ

20 ліпеня споўнілася 80 гадоў **Георгію Уладзіміравічу Ярмоленка**, доктару філалагічных навук, прафесару, вядомаму вучонаму-лінгвісту, аўтару шэрага навуковых працаў і вучэбных дапаможнікаў.

Г.У. Ярмоленка спалучае ў сабе рысы прынцыповасці і добразычлівасці, патрабавальнасці і чуласці. У год яго юбілея мы жадаем яму шчасця, радасці ў цяжкай, але высакароднай педагагічнай працы.

*СУПРАЦОЎНІКІ КАФЕДРЫ АГУЛЬНАГА І СЛАВЯНСКАГА МОВАЗНАЎСТВА*



## НА ДЕНЬ РОЖДЕНИЯ ГЕОРГИЯ ВЛАДИМИРОВИЧА ЕРМОЛЕНКО

*Велика страна Болгария!*
*Воспета в мифах, песнях, ариях!*
*Она рождала великих людей*
*От седой древности до наших дней.*
*Сказать бы только об античном времени,*
*О гордом фракийском племени,*
*О том, как на Фракию персы напали*
*И как с позором оттуда бежали.*
*Бог Дионис возлюбил эти дали,*
*Где песни Орфея звучали,*
*Где Орфей-певец, Анахарсис-мудрец*
*Родину собой прославляли.*
*Здесь философы рождались,*
*Мир веками удивляли*
*Протагор и Демокрит,*
*Тот великий Абдерит*
*А в соседстве - Стагирит*
*Аристотель.*
*Отсюда вышел великий Спартак*
*Римский мир потрясал он так,*
*Что над державой могучей*
*Нависли черные тучи.*
*А дальше? В средневековье*
*Сюда Кирилл и Мефодий*
*Веру христианскую, азбуку славянскую*
*Людям передали.*
*А Петр и Асень царство основали.*
*Прошли столетья*
*Бед и лихолетья.*
*С Россией в паре*
*Турков свергали,*
*С ней же болгары*
*Фашистов гнали.*
*Писателей болгарских*
*Веками шла плеяда*
*Уже Цамблак и Хилендарский*
*Писатели что надо!*
*Раковский, Михайловский,*
*И Каравелов, Вазов*
*И Ботев - ряд алмазов*
*Литературы славной.*
*И не было им равных!*
*Славейков и Стоянов,*
*Кирков, Велков, Троянов,*
*Харасланов и Петров,*
*Данчев, Велчев, Королев...*
*Вечно смешно и ново,*
*Что сказано в Габрово!*
*Всего не перечислишь,*
*Величия не осмыслишь!...*
*Но филологов армию*
*Взрастила Болгария,*
*Они знают, кто мал,*
*А кому пьедестал,*
*Среди них наш Георгий.*
*«София» - мудрость, София - столица*
*В городе мудрости стоит явиться.*
*Киевский мальчик в Софии явился,*
*В софийской школе языкам учился,*
*Болгария его родиной стала,*
*Мудрость свою ему передала.*
*Говорят, физику лирик не брат,*
*Однако наш славянист*
*Раньше в Софии окончил физмат,*
*А потом уж он же - лингвист.*
*На родину предков судьба позвала,*
*Людей вернулось немало.*
*А в советской стране широкой*
*Специалисты нужны на востоке...*
*И далекая вскоре дорога*
*В Казахстан привела фило-лога...*
*Труд, талант и призвание*
*Принесли ему звание.*
*Ермоленко имя известно*
*И более дальним, и местным!*
*Но климат казахстанский,*
*Когда окликнул друг,*
*Сменил он на славянский -*
*Он в Беларуси вдруг!*
*Все в Гродно ему рады.*
*Язык болгарский сей*
*Славистики отряды*
*Хотят постичь скорей!*
*Массу трудов и бессонных мук*
*Имеет он за плечами...*
*И вот наш ученый - уже доктор наук,*
*Оказался профессор меж нами.*
*За многие прошедшие годы*
*В словесности метод новый*
*Профессор наш открыл,*
*В науке применил.*
*Виват, статистика! -*
*Сказал он в лингвистике.*
*«Виват!» - без сомнения,*
*скажут поколения.*
*Подлинность Чехова, Шолохова слог*
*Метод Ермоленко обнаружить смог.*
*Подтвердил он свое звание*
*В мировом языкознании!*
*Здоровья и радости,*
*Жить до ста без старости*
*Ему желают все без исключения,*
*И поздравляют с его Днем рождения!*

**Б.Б.ВІЦ-МАРГУЛЕС**



# НАТХНЕННЕ

## НИКОЛАЙ СПОРНИК

Спой мне, ветер, осеннюю песню,
Спой про желтые листья берез.
Сердце глупое, тихо, не бейся -
Не вернешь необроненных слез...
Спой мне, ветер, про лунные блики,
Про седые тропинки в росе,
Спой, чтоб видеть мне снова гвоздики,
Заплетенные в черной косе.
Спой, чтоб слышать мне смех вновь чудесный,
Колокольчиком брызнувший в ночь...
Спой мне, ветер, осеннюю песню,
Если хочешь ты сердцу помочь.

Разорвала гармонь за околицей
Черный саван ночной тишины.
И душа моя, маясь бессонницей,
В даль помчалась под струи луны
И, купаясь в траве, неуемная,
В такт веселым и грустным ладам,
Увлеченная песнею вольною,
Лихо мчится по чьим-то следам.

Я шел травой. которая по пояс,
Под чистым небом, не сбивая рос,
Я пел и плакал, как несжатый колос,
Как травы, не познавшие покос.
А из души в виски стуча издревле,
Какой-то голос мне твердил вразброс:
«...Ведь ты, родившись, вышел из деревни,
В которой телом и душой возрос».

Я говорил березе: «Не шуми.
Примчится вихрь-ветер сквозникастый,
На первый взгляд - задорный и вихрастый,
Залетный, оторвавшись от семьи,
Листву отнимет, дьявольски игрист,
К траве прильнет, как будто кувыркаясь,
И нежным майским цветом захмеляясь,
Сорвет, на землю бросив, нежный лист».
... И что же мне ответила береза,
Глядя на лист, лежащий на росе:
«...Пусть ветер рвет листву в моей косе
И знает - боль и радость - это слезы».

Переспела земляника, переспела,
Стала терпкою и горькою на вкус.
Не успела полюбить я, не успела,
Растеряла ожерелье своих бус.

Когда плачут гитары цыган
Над ковыльною степью седою,
Мое сердце исходит тоскою
И душа изнывает от ран.

Секунданты мои - боль и вера
Без медалей и без эполет.
Каждый день меня водят к барьеру,
Позабыв зарядить пистолет.

Тихо падают листья осенние
И стихает звучанье струны,
И уходят из жизни Есенины,
Покидая вертеп сатаны...
И под крик журавлиный с надрывами,
Осыпающий грустью поля,
Плачет яркой росою под ивами
Поседевшая наша земля.
Перекошены ветром непрошенным
Белоснежные руки берез
И по травам увядшим, нескошенным
Бьет картечью разбойник-мороз.
И в деревне, пустынной и вымершей,
Кисть рябины сгорает огнем,
А к душе моей, слезной и вымокшей,
Подбирается черт с кистенем.
Я прожил в светлой сказке мгновение,
Только сказка окончилась вдруг,
И меня ослепило прозрение,
Что я влип в этот дьявольский круг.
И теперь, остывая и падая,
Словно листья, горю я мечтой,
Что моей сокровенной отрадою
Будет только лишь вечный покой...

Незанузданные кони,
Непокорные в неволе,
Неподкованные кони
Рвутся в поле к своей доле,
Необъезженные кони,
Мне бы вас еще коснуться
И от этой от неволи убежать
И не вернуться.

Я от вольного ветра хмельной
И под бархатом неги лукавой
Не нашел я дороги домой,
А пошел в степь, в пахучие травы.

Еще все спит на сенокосном стане,
Алеет на востоке небосвод,
Березка, подобрав подол, в тумане
Как будто речку переходит вброд.

Надо жить в этом дьявольском мире,
Воздух с кровью глотая и дым,
Оставаясь еще молодым
И безропотно преданным лире.

Пусть говорят, что разум - строгость линий.
Но вопреки невызревшим умам,
Берем его мы, как губами иней
Из молока у безответных мам.

Переполнен мой кубок янтарным вином,
А на дне его - дьявол мне душу щекочет
И в глаза мои смотрит, и нагло хохочет,
И на ухо мне шепчет о чем-то былом.
И во мне вдруг встречаются нежность и зло,
Порожденные дьявольской силою страшной,
И пустеет мой кубок, и я бесшабашный,
Ощущаю в безумстве только тепло.

Я одинок, один - какое счастье
Быть одному, свободу ощутив,
Пусть на дворе ненастное ненастье,
Оно вдвойне источник моих сил.
Я одинок. Похоронив усталость,
Рождаюсь вновь, пусть даже хоть чуть-чуть.
И я молюсь душе, в которой сладость
Осталась, как неведомая грусть.



INTERNATIONAL SOROS SCIENCE EDUCATION PROGRAM



# МЕЖДУНАРОДНАЯ СОРОСОВСКАЯ ПРОГРАММА ОБРАЗОВАНИЯ В ОБЛАСТИ ТОЧНЫХ НАУК

## ПОДПРОГРАММА «СОРОСОВСКИЕ ДОЦЕНТЫ»

Международная Соросовская программа образования в области точных наук (ISSEP) в Беларуси объявляет конкурс на получение гранта «Соросовский доцент» теми преподавателями высшей школы, которые добились высоких показателей в обучении студентов по специальностям: математика, физика, химия и биология, науки о Земле.

Грант Соросовского доцента будет выделяться сроком на 10 месяцев в размере 150 долларов США ежемесячно. Всего на Республику Беларусь выделяется 18 грантов.

Обязательными условиями участия в конкурсе являются:

- наличие степени кандидата или доктора наук и работа в высшем учебном заведении в должности доцента (представляется копия аттестата доцента и справка о занимаемой должности);
- наличие не менее трех публикаций в течение последних пяти лет: статей в отечественных реферируемых журналах (список журналов см. ниже) или в зарубежных периодических изданиях (исключая тезисы докладов на конференциях), книг по специальности, монографий, методических пособий.

Те, кто отвечает этим требованиям, могут заполнить анкету по прилагаемому образцу и отправить ее до 10 октября 1995 г. (согласно почтовому штемпелю) по адресу: Минск, проспект Ф.Скорины 66; справки по телефону: (0172) 39-57-45.

При отборе кандидатов на получение звания «Соросовский доцент» будут приняты во внимание также следующие критерии:

- разработка новых лекционных курсов для студентов и их чтение, постановка новых практикумов, проведение семинарских занятий по новым дисциплинам и направлениям;
- публикация учебников, монографий, книг, подготовка методических пособий для студентов;
- подготовка научных кадров;
- оценка студентами лекций, семинаров, практикумов (опросы будут осуществлены сотрудниками ISSEP без участия соискателя);
- получение грантов на исследовательскую или педагогическую деятельность от отечественных и международных фондов;
- государственная и международная премия за учебники для школ или вузов, за научную или педагогическую деятельность;
- участие в международных конференциях и совещаниях с докладами.

Решение о присвоении грантов будет принято международным Правлением Программы, выплата грантов будет осуществляться поквартально, начиная с 1 сентября 1995 года.

### АНКЕТА КАНДИДАТА НА ЗВАНИЕ «СОРОСОВСКИЙ ДОЦЕНТ»

Фамилия, имя, отчество участвующего в конкурсе на звание «Соросовский доцент» ________________

Год рождения ________________

Образование, ученые степени и звания с указанием года их получения и N диплома ВАКа ________

Основная специальность ________________

Общий стаж педагогической деятельности ______

Место работы за последние 5 лет с указанием занимаемой должности (начните с последней) _______

Список лекционных курсов, семинарских занятий или практикумов для студентов за последние пять лет с указанием института, где читались лекции или проводились семинары и практикумы, и количества часов в неделю, потраченных на каждый из курсов, семинаров или практикумов ________________

| Название лекционного курса, семинара или практикума (если курс, семинар или практикум был заново разработан, указать это под каждым названием | Год | Название и расположение вузов, в которых работал кандидат в Соросовские доценты | Число студентов, слушавших лекции или участвовавших в семинаре или практикуме |
|---|---|---|---|

Список лиц, защитивших кандидатские диссертации под руководством кандидата в Соросовские доценты с указанием названий диссертаций. В случае, если представляемый был соруководителем диссертаций, указать, кто был другим соруководителем. (Прилагаются копии титульных листов авторефератов диссертаций с оборотом).

Список публикаций за последние 5 лет (прилагаются копии или оттиски наиболее важных из них) ________________

Премии (государственные, международные и другие), награды ________________

Полученные и ожидаемые гранты на исследования ________________

Список учебников для вузов и школ, практических руководств для студентов, монографий, подготовленных соискателем за весь период работы (прилагаются копии титульных листов) ________________

Участие в международных конференциях и совещаниях с докладами ________________

Главные научные достижения соискателя ______

Среднегодовой доход в 1993-1994 годах _______

Адрес, телефоны (рабочий и домашний), факсы и e-mail кандидата в Соросовские доценты ____________

### СПИСОК ЖУРНАЛОВ, ПУБЛИКАЦИИ СТАТЕЙ В КОТОРЫХ БУДУТ ПРИНИМАТЬСЯ ВО ВНИМАНИЕ МЕЖДУНАРОДНОЙ СОРОСОВСКОЙ ПРОГРАММОЙ ОБРАЗОВАНИЯ В ОБЛАСТИ ТОЧНЫХ НАУК

Автоматика и телемеханика, Акустический журнал, Алгебра и анализ, Алгебра и логика (Сибирское отделение РАП), Архив анатомии, гистологии и эмбриологии (морфология), Астрономический вестник, Астрономический журнал, Астрофизика, Биологические мембраны, Биология моря, Биоорганическая химия, Биополимеры и клетка, Биофизика, Биохимия, Ботанический журнал, Бюллетень экспериментальной биологии и медицины, Бюллетень Московского общества испытателей природы, серия биологическая, Вестник Московского университета (Серия 1. Математика,Механика. Серия 2. Химия. Серия 3. Физика, Астрономия. Серия 4. Геология. Серия 16. Биология. Серия 17. Почвоведение), Вестник Санкт-Петербургского университета (Физика, Химия), Вопросы вирусологии, Вопросы ихтиологии, Вопросы медицинской химии, Вопросы теории плазмы, Вулканология и сейсмология, Высокомолекулярные соединения (серия А, серия Б), Генетика, Геологический журнал, Геология и геофизика, Геоморфология, Геотектоника, Геофизический журнал, Геохимия, Гидробиология, Гидрофизический журнал, Горный журнал, Дискретная математика, Дифференциальные уравнения, Доклады Академии наук Беларуси, Доклады Академии наук России, Доклады Академии наук СССР, Доклады Академии наук Украины, Журнал аналитической химии, журнал Всесоюзного химического общества им. Д.И.Менделеева, Журнал высшей нервной деятельности им И.П.Павлова, Журнал вычислительной математики и математической физики, Журнал микробиологии, эпидемиологии и иммунологии, Журнал неограничеcкой химии, Журнал общей биологии, Журнал общей химии, Журнал органической химии, Журнал структурной химии, Журнал технической физики, Журнал физической химии, Журнал эволюционной биохимии и физиологии, Журнал экспериментальной и теоретической физики, Записки Всероссийского минералогического общества, Зоологический журнал, Известия АН Беларуси, Известия высших учебных заведений (География, Математика, Радиофизика, Радиоэлектроника, Физика, Химия и химическая технология), Известия РАН (Серия Биологическая, Серия Геологическая, Серия Математическая, Серия Механика жидкости и газа, Серия Механика твердого тела, Серия Физика атмосферы и океана, Серия Физика Земли, Серия Физическая, Серия Химическая), Известия Сибирского отделения АН СССР (серия химических наук), Измерительная техника, Иммунология, Квантовая электродинамика, Кибернетика, Кинетика и катализ, Коллоидный журнал, Космические исследования, Краткие сообщения по физике ФИАН им. П.Н.Лебедева, Кристаллография, Лазерная физика (на английском языке), Магнитная гидродинамика, Математические заметки, Математический сборник, Металлофизика, Метеорология и гидрология, Механика жидкостей и газов, Механика композитных материалов, Механика твердого тела, Микология и фитопатология, Микробиология, Минералогический журнал, Молекулярная биология, Молекулярная генетика, Микробиология и вирусология, Научные доклады высшей школы: «Биологические науки», Нейрохимия, Нейрофизиология, Неорганические материалы, Океанология, Онтогенез, Оптика атмосферы и океана, Оптика и спектроскопия, Палеонтологический журнал, Паразитология, Петрология, Письма в «Астрономический журнал», Письма в «Журнал технической физики», Письма в «Журнал экспериментальной и теоретической физики», Поверхность, Физика, химия, механика, Почвоведение, Прикладная математика и механика, Радиационная биология, Радиоэкология, Радиотехника и электроника, Радиохимия, Реакционная способность органических соединений, Сибирский математический журнал, Сверхпроводимость: химия, физика, техника, Сверхпроводники, Теоретическая и математическая физика, Теоретическая и экспериментальная химия, Теория вероятностей и ее применение. Теория вероятностей и математическая статистика, Теплофизика высоких температур, Труды МИАН им. В.А.Стеклова, Труды Московского математического общества, Труды Санкт-Петербургского отделения Математического института им. В.А.Стеклова, Труды ФИАН им. П.Н.Лебедева, Украинский ботанический журнал, Украинский биохимический журнал, Украинский математический журнал, Украинский физический фурнал, Украинский химический журнал, Успехи математических наук, Успехи современной биологии, Успехи физиологических наук, Успехи физических наук, Успехи химии, Фармакалогия и токсикология, Физика горения и взрывов, Физика и техника полупроводников, Физика металлов и металловедение, Физика низких температур, Физика твердого тела, Физика элементарных частиц и атомного ядра, Физиологический журнал, Физиология растений, Физиология человека, Функциональный анализ и его приложения, Физика Земли, Физика плазмы (на английском языке), Химико-фармацевтический журнал, Химическая физика, Химия гетероциклических соединений. Химия высоких энергий, Химия плазмы, Химия природных соединений, Цитология, Цитология и генетика, Экспериментальная биология, Электрохимия, Энтомологическое обозрение, Ядерная физика.



## ВІНШУЕМ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ!

**АКЛАДНІКАВУ Вольгу Міхайлаўну**, вартаўніка вучэбнага корпуса N 4.

**БЕЛЯКОВУ Наталлю Мікалаеўну**, выкладчыка кафедры англійскай і французскай моваў.

**КАРПАВУ Алену Іванаўну**, старшага выкладчыка кафедры польскай філалогіі.

**ЛАПУКА Зофью Анатолеўну**, выхавацеля інтэрната N 4.

**МІНІШАВУ Галіну Міхайлаўну**, намесніка загадчыка бібліятэкі.

**ПРЫМАКІНУ Ядзвігу Адамаўну**, дзяжурную вучэбнага корпуса N 1.

**РОДЗІК Надзею Іванаўну**, старшага выкладчыка кафедры псіхалогіі і педагогікі пачатковай школы.

**САПАТАВУ Ангеліну Іванаўну**, інжынера 1 катэгорыі кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі.

**БУРЫКАВА Аляксандра Дзмітрыевіча**, загадчыка кафедры інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.

**БЯЛЫХ Юрыя Эдуардавіча**, загадчыка кафедры дастасоўнай матэматыкі.

**ЖАРЫКАВА Уладзіміра Іванавіча**, агента гаспадарчай часткі.

**ЖАРНОВА Аляксандра Міхайлавіча**, дацэнта кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі.

**ІСТОМІНА Віктара Серафімавіча**, дацэнта кафедры англійскай і французскай моваў.

**ПРАКОП'ЕВА Івана Іванавіча**, дацэнта кафедры педагогікі.

**СЦЯПУРУ Івана Міхайлавіча**, дацэната кафедры АГ, функцыянальнага аналіза і методыкі матэматыкі.

**ФЁДАРАВА Ігара Алегавіча**, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі.

## АБ'ЯВЫ


- **Здаю ў бясплатную арэнду палову дачнага ўчастка ў вёсцы Горніца. Даведкі па тэлефоне 33-84-45 пасля 18 гадзін.**
- **Зборка мэблі, ашкляненне(з матэрыяла заказчыка). Тэл. 33-97-65 з 18 да 21 гадзіны.**
- **Прадаю шчанятаў бультэр'ера. Тэл. 31-79-57.**


## КОЛЬКІ ПЛАЦІЦЬ ЗА НАВУЧАННЕ

Загадам рэктара N 319 ад 31.05.1995 г. плата за навучанне ў 1995-96 навучальным годзе для студэнтаў гуманітарнага факультэта ўстаноўлена ў наступных памерах:

1.1. Для грамадзян Рэспублікі Беларусь і беларусаў, якія пражываюць за мяжою:

1.1.1. Дзённая форма навучання:

- спецыяльнасці «Правазнаўства», «Міжнародныя эканамічныя адносіны», «Замежная мова», «Псіхалогія», інжынерныя спецыяльнасці - 4.500.000 руб;

- педагагічныя спецыяльнасці - 4.000.000. руб;

1.1.2. Завочная і вячэрняя формы навучання:

- спецыяльнасці «Правазнаўства», «Міжнародныя эканамічныя адносіны», інжынерныя спецыяльнасці - 3.000.000 руб;

- педагагічныя спецыяльнасці - 2.500.000 руб.

1.2. Для грамадзянаў іншых дзяржаваў СНД і бліжняга замежжа ў двайным памеры ад вызначаных лічбаў п. 1.1.

Плата за навучанне можа быць праведзена па сяместрах: першая частка аплаты павінна быць унесена да 15 верасня 1995 г., другая частка аплаты - да 15 лютага 1996 г.

Разліковы рахунак універсітэта: 149307, Белбізнесбанк,г.Гродна, МФО 152101, код 705. Тэлефоны для даведкаў: 47-14-58, 33-96-01.

*Дэканат гуманітарнага факультэта*

# ГУМАР

### У слоўнік першакурсніка

**Аўдыторыя** - зала, у якой чытаюцца лекцыі; зборная назва слухачоў лекцыі.

Падзяляюцца на шчаслівыя і нешчаслівыя.

Калі вы спазніліся і не адважваецеся ўвайсці, не хвалюйцеся, кантакт паміж вамі і выкладчыкамі можа быць устаноўлены з дапамогай дзіркі ў дзвярах, прасвідраванай умелымі старшакурснікамі і якая засталася цэлай і не пашкоджанай (вось цуд!) нават пасля рамонту.

**Дэканат** - адміністрацыйна-вучэбнае ўпраўленне факультэта, якое ўзначальваецца дэканам.

Гэта адзінае месца, дзе студэнт можа стаяць вельмі доўга і цярпліва чакаць. У пачатку вучобы - па асабістым жаданні, у канцы вучобы - таксама па асабістым жаданні... дэкана.

**Куратар** - папячыцель, апякун.

Уявіце сабе класнага кіраўніка, які на вас не сварыцца, не прымушае ўбіраць памяшканне, не... не... не... Гэта і будзе куратар.

### Студэнцкі гумар

У інстытуце:

- Не магу паверыць, што вы скончылі сярэднюю школу!
- Хіба ў мяне шмат памылак?
- У тым і справа, што ў вас няма ніводнай памылкі!

☺ ☺ ☺

- У мяне пяць дачок-студэнтак.
- Напэўна, цяжка пракарміць і апрануць пяцёра дзяцей?
- Не пяцёра, а васьмёра - тры з іх выйшлі замуж за студэнтаў.

☺ ☺ ☺

Студэнт піша маці: «Мамачка, вышлі мне, калі ласка, цёплыя шкарпэткі, але толькі загарні іх так, каб яны не сапсаваліся ад сала і каўбасы».

☺ ☺ ☺

Фатограф рыхтаваўся фатаграфаваць бізнесмена з сынам-студэнтам.

- Вы сядайце вось у гэтае крэсла, а ты, сынок, станавіся побач і пакладзі руку на бацькоўскае плячо.
- А ці не будзе поза больш натуральнай, - перапыніў яго бізнесмен, -калі ён пакладзе руку ў маю кішэню?

☺ ☺ ☺

-Як вам не сорамна! Студэнта-механіка пасадзілі паліто здымаць!
- Ну і што тут такога? Хіба гэтая работа не механічная?!




Рэдактар Н.КРАСНІЦКАЯ.
Камп'ютарная вёрстка А.СЯМЁНАЎ.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Матэрыялы друкуюцца на мове арыгінала.

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём - 1 друк. арк. Зданаў набор 25.09.95г.
Заказ 4024

Газета набрана і зверстана на камп'ютарнай тэхніцы выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйненай друкарні, вул. Паліграфістаў, 4.
Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.



Наш адрас:
230023, г. Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97



Наклад 700 асобнікаў.

Заснавальнікі: Вучоны Савет універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.